WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 КРАСАВІКА 2010 г. ПЯТНІЦА № 78 (26686)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Прамая лінія

## НА ПРЫЁМ ДА АЛЕРГОЛАГА

Кожны трэці чалавек на зямлі пакутуе на тую або іншую форму алергіі. Колькасць такіх хворых з кожным дзесяцігоддзем падвойваецца. З чым гэта звязана? Чаму ў адных людзей узнікае алергія, а ў другіх — не? Якіх правілаў у паўсядзённым жыцці трэба прытрымлівацца тым, хто схільны да алергічных рэакцый? Як змякчыць праяўленні алергіі? Якія рэчывы могуць быць алергенамі? Пра гэта вы зможаце пагаварыць падчас нашай «прамой лініі» **з кандыдатам медыцынскіх навук, дацэнтам кафедры алергалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Людмілай Вячаславаўнай МАСЛАВАЙ.** «Прамая лінія» адбудзецца **28 красавіка, у сераду, з 12.00 да 13.30 па нумарах: 8(017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна накіраваць па пошце альбо пакінуць па нумарах: 8(017) 287 18 36 і 287 18 29.**

# КІРАЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ ВЫСОКА ЦЭНІЦЬ ЗАСЛУГІ БЕЛАРУСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора на ўрачыстым пасяджэнні Сінода Беларускай праваслаўнай царквы, якое адбылося ў мінскім Доме міласэрнасці.**

«У дзяржавы і царквы — агульныя задачы: клопат аб дабрабыце народа, яго маральным здароўі, захаванні спакою і стабільнасці ў нашым беларускім доме. Пры гэтым моцная ўлада з'яўляецца залогам непахіснасці становішча праваслаўнай царквы ў грамадстве», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Перад пачаткам пасяджэння кіраўнік дзяржавы пагаварыў з Мітрапалітам Мінскім і Слуцкім, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі Філарэтам. Потым Прэзідэнт выступіў на адкрыцці пасяджэння Сінода з уступным словам, у якім ён павіншаваў Уладыку Філарэта з 75-годдзем, а таксама канстатаваў значны ўклад царквы ва ўмацаванне самабытных духоўных каштоўнасцяў і ідэалаў беларускага народа.

«Паміж свецкай і духоўнай уладай у Беларусі ўсталяваліся сугучныя адносіны, якія ў праваслаўі прынята называць сімфоніяй, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Не выпадкова менавіта з Беларускай праваслаўнай царквой у 2003 годзе было заключана пагадненне аб супрацоўніцтве. Гэта цудоўны прыклад такой цеснай сумеснай дзейнасці, аналагаў якой няма больш нідзе ў праваслаўным свеце».

Сёння адроджаны епархіі, якія гістарычна існавалі на землях Беларусі, забяспечана аднаўленне і будаўніцтва больш як тысячы храмаў і манастыроў, вядзецца падрыхтоўка нацыянальных кадраў свяшчэннаслужыцеляў у духоўнай акадэміі і семінарыі. «Аднаўлены Крыж Ефрасінні Полацкай і рака Прападобнай, на беларускую мову перакладаецца Свяшчэннае Пісанне», — нагадаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, ініцыятывы БПЦ у справе ўмацавання канструктыўнага дыялога розных веравызнанняў і культур даюць адчувальны вынік.

Аляксандр Лукашэнка таксама выказаў думку, што «Беларускай праваслаўнай царкве пашанцавала, што ў яе ёсць Уладыка Філарэт. Пашанцавала ў тым плане, што ўжо не адзін дзясятак гадоў гэты чалавек так плённа працуе ў імя міру, спакою і дабрабыту ў нашай Айчыне».

Пад кіраўніцтвам цяперашняга прадстаяцеля Беларускі экзархат заўсёды ішоў у рэчышчы выбранага народам курсу развіцця краіны, паслядоўна падтрымліваючы гэты курс.

«Вы, Ваша Высокапраасвяшчэнства, унеслі вялікі ўклад ва ўстараненне той барыкады канфрантацыі і неразумення, якая раздзяляла дзяржаву і царкву многія дзесяцігоддзі», — адзначыў Прэзідэнт.

«З асаблівымі пачуццямі ўдзячнасці і гордасці я віншую вас з 75-гадовым юбілеем. У народзе гэты юбілей называюць брыльянтавым», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Бог дараваў Мітрапаліту Філарэту моцнае здароўе. «І я хацеў бы, каб яно і далей захоўвалася ў вас на доўгія гады», — пажадаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка ўручыў прадстаяцелю БПЦ спецыяльны ліст аб аб'яўленні падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што Уладыка Філарэт, як ніхто іншы, адзначаны многімі высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі. «Вы адзін з першых герояў суверэннай Беларусі», — нагадаў ён.

Нядаўна Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл удастоіў прадстаяцеля БПЦ найвышэйшай царкоўнай узнагароды для праваслаўных мітрапалітаў — права пераднясення крыжа ў час богаслужэння.

Сёння падчас пасяджэння Сінода адбылася цырымонія ўручэння Мітрапаліту Філарэту перадноснага крыжа.

Нефармальна гэты крыж лічыцца распазнавальным знакам прадстаяцеляў памесных (самастойных) праваслаўных цэркваў. У Рускай праваслаўнай царкве акрамя Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі права праводзіць богаслужэнні з гэтым сімвалам да гэтага часу меў толькі Мітрапаліт Кіеўскі і ўсяе Украіны.

Адказваючы на віншаванні, Уладыка Філарэт сказаў: «Я дзякую ўсім за добрыя словы і пажаданні. І прашу ўсіх вас сваімі малітвамі падтрымаць мяне ў маім служэнні, каб яно было на славу Божую».

«Мір на беларускай зямлі — гэта не толькі агульная задача для Прэзідэнта краіны і кіраўніка экзархата, але і асноўная жыццёвая каштоўнасць нашага народа. Адсутнасць вайны, грамадскае супакаенне і спакой у сэрцах людзей — гэта задачы вырашаюцца не раз і назаўсёды, а патрабуюць штодзённых і штогадзінных намаганняў. Дасягнуць гэтай трыадзінай мэты можна толькі разам», — падкрэсліў Мітрапаліт.

Філарэт выказаў удзячнасць Прэзідэнту і ўсім дзяржаўным дзеячам Беларусі за «тую грамадзянскую свабоду, пры якой праваслаўная царква сёння мае магчымасць ажыццяўляць сваё місіянерскае служэнне і робіць гэта з поспехам».

Пасля ўрачыстай часткі пасяджэння Прэзідэнт і Патрыяршы Экзарх наведалі храм Дома Міласэрнасці, дзе Аляксандр Лукашэнка запаліў свечку перад асаблівым абразом — дакладным спісваннем цудатворнага абраза Божай Маці «Скорапаслушніца», які захоўваецца на святой гары Афон.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Надвор'е

## У ВЫХАДНЫЯ МОКРЫ СНЕГ І ЗАМАРАЗКІ ДА МІНУС 5

**У выхадныя ўсталюецца няўстойлівае надвор'е, бо на тэрыторыю Беларусі завітае халоднае і вільготнае паветра з боку Скандынавіі, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга ФЯДОТАВА.**

Сёння і ў суботу паўсюдна пройдзе кароткачасовы дождж, месцамі мокры снег. У пятніцу будзе моцны парывісты вецер. Тэмпература ўночы на суботу ад мінус 2 да плюс 5 градусаў, удзень 5—12 цяпла, у Гомельскай вобласці — да плюс 15.

У нядзелю атмасферны ціск павялічыцца і ападкаў амаль не будзе, толькі на паўночным усходзе магчымы мокры снег і дождж. Тэмпература ўначы знізіцца да мінус 5—плюс 2 градусаў, удзень 8—15 цяпла, на Брэсцкай вобласці да 17 градусаў.

У пачатку наступнага тыдня чакаецца ўмерана цёплае надвор'е без істотных ападкаў. Уначы — 0—6 цяпла, пры праясненнях да мінус 3 градусаў, удзень плюс 10—17. У панядзелак будзе сонечна, а вось у аўторак магчымыя дажджы.

**Сяргей КУРКАЧ.**



Фота БЕЛТА.

## СПАЖЫВЕЦКІ РЫНАК «ПРАЧЫНАЕЦЦА»

**Пра бачнае ажыўленне ў першым квартале гэтага года на спажывецкім рынку рэспублікі паведамляюць у Міністэрстве эканомікі.**

Так, паводле звестак міністэрства, рознічны тавараразварот, уключаючы грамадскае харчаванне, праз усе каналы рэалізацыі ў студзені—сакавіку павялічыўся на 13,3 працэнта ў параўнанні з узроўнем аналагічнага перыяду мінулага года (прагноз на год 14—15 працэнтаў). У параўнанні з сёлетнім студзенем прырост склаў 6,1 працэнтнага пункта. Што датычыцца долі продажу айчынных тавараў магазінамі, то яна ў аб'ёме іх рознічнага тавараразвароту ў першым квартале склала 76,9 працэнта, у тым ліку харчовых тавараў — 84,9 працэнта, нехарчовых — 65,3 працэнта. Тэмп росту рэалізацыі платных паслуг насельніцтву праз усе каналы рэалізацыі ў студзені—лютым забяспечаны на ўзроўні 105,7 працэнта да ўзроўню студзеня лютага 2009 года пры прагнозе на 2010 год 113—114 працэнтаў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Выбары-2010

## НОВАЕ ПА-СТАРОМУ



**Час «Ч» ужо блізіцца. За няпоўныя чатыры месяцы, што прамільгнулі, нібы знічка, фарміраваліся камісіі, вылучаліся і здымаліся кандыдаты, наклейваліся і зрываліся лістоўкі, агучваліся абяцанні і пахвальбы. Арганізатары і ўдзельнікі выбараў практыкаваліся ў прымяненні змененага заканадаўства... Шмат чаго з'явілася новага, але хапае і таго, што адбывалася па-старому. Што ж мы маем на выхадзе? Падсумоўваем разам са старшынёй ЦВК Лідзіяй ЯРМОШЫНАЙ.**

***Эксклюзіўнае інтэрв'ю чытайце ў заўтрашнім нумары «Звязды».***

БЕЛИНВЕСТБАНК

СООБЩАЕТ

**5 мая 2010 года в помещении Центрального банка по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 29 в 11.00 ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ БАНКА В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ.**

В повестку дня внеочередного общего собрания акционеров банка (далее – Собрание) внесены следующие вопросы:

1. Об утверждении изменений в Устав Открытого акционерного общества «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк»
2. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи

Дата формирования реестра владельцев акций, на основании которого составляется список лиц, имеющих право на участие в Собрании, – 22 апреля 2010 года.

Бюллетени для заочного голосования, иную информацию о проведении Собрания лица, имеющие право на участие в нем, могут получить под роспись при обращении в банк по адресу: 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29 или в его филиалы по месту учета акций до 30 апреля 2010 года.

Окончательная дата представления заполненных бюллетеней для заочного голосования – 2 мая 2010 года.

**Телефоны для справок: (8 017) 239 01 41, 239 01 42.**

www.belinvestbank.by

*Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» УНП 807000028 220002, г. Минск, пр-т Машерова, 29. Лицензия на осуществление банковской деятельности № 3, выдана Национальным банком Республики Беларусь 27.10.2006.*

## НЕБЯСПЕЧНАЯ ЗАБАВА

**Для 21-гадовага навучэнца, які павышаў сваю кваліфікацыю ў адной з навучальных сталічных устаноў, акрабатычныя трукі на балконе скончыліся трагічна.**

Як паведаміў **старшы памочнік пракурора горада Мінска Сяргей БАЛАШАЎ,** малады чалавек на час навучання быў пасялены ў інтэрнат на завулку С. Кавалеўскай. Тут у сераду і здарылася няшчасце: пасля застолля ў пакоі інтэрната хлопца пацягнула на балкон агульнай кухні, дзе ён пачаў дэманстраваць гледачам свае здольнасці. Навучэнец пералез праз агароджу балкона, які размешчаны на пятым паверсе, на той бок і пачаў рабіць розныя «па». У нейкі момант не здолеў утрымацца і сарваўся ўніз. Малады чалавек загінуў на месцы здарэння.

**Ігар ГРЫШЫН.**

БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК

ТРАДИЦИИ НАДЕЖНОСТЬ КОМПЕТЕНТНОСТЬ

**ОАО «Белвнешэкономбанк»**

Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2010 г.**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.04.2010 г. | на 01.04.2009 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 66769,7 | 60408,9 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 98037,4 | 138687,7 |
| 4 | Ценные бумаги | 1103 | 165871,8 | 4597,2 |
| | для торговли | 11031 | – | – |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | – | 4597,2 |
| | в наличии для продажи | 11033 | 165871,8 | – |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 519409,7 | 237708,2 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 1331862,0 | 1285241,3 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 5871,6 | 3409,0 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 85348,1 | 77844,7 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 16988,8 | 16799,3 |
| 10 | ИТОГО АКТИВЫ | 110 | 2290159,1 | 1824696,3 |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 2188,1 | 627,4 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 465865,9 | 408162,6 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 1022728,2 | 936614,3 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | 5070,9 | 1804,6 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 33955,8 | 31553,9 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 1529808,9 | 1378762,8 |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 605017,0 | 327483,0 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | – | – |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 30584,0 | 20879,1 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 66614,3 | 43152,1 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 58134,9 | 54419,3 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 760350,2 | 445933,5 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 2290159,1 | 1824696,3 |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 800794,9 | 578625,7 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 586443,7 | 444936,6 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2010 г.**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.04.2010 г. | на 01.04.2009 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 73158,8 | 44399,8 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 22606,1 | 23386,8 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 50552,7 | 21013,0 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 14937,7 | 12165,9 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 2031,0 | 1988,8 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 12906,7 | 10177,1 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 5331,6 | 10309,0 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 109,2 | 33,1 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | 198,9 | 5,1 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 18529,1 | 3208,9 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 3247,0 | 10182,6 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 31524,9 | 24950,7 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 6230,6 | 7757,2 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 4133,1 | 4691,8 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 11928,4 | 11111,3 |

**Председатель Правления** **Г.А. Егоров**

**Главный бухгалтер** **З.С. Кушнерова**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 6 от 27.10.2006. УНП 100010078.

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## УЛАДЫ ЗША ПРАДСТАВІЛІ НОВЫ ДЫЗАЙН КУПЮРЫ Ў $100



**Амерыканскія ўлады афіцыйна прэзентавалі новы дызайн адной з самых папулярных купюр у свеце — вартасцю 100 долараў. У зварот яны паступяць з 10 лютага наступнага года, паведамляецца ў распаўсюджаным сумесным прэс-рэлізе Федэральнай рэзервовай сістэмы ЗША, Міністэрства фінансаў і Сакрэтнай службы краіны.**

На банкноце новага ўзору будзе ўсё той жа партрэт Бенджаміна Франкліна, аднак ёсць і адрозненні. Так, на новай купюры знаходзіцца ахоўная сіняя стужка з 3D-эфектам, аб'екты на якой рухаюцца ў розныя бакі пры поглядзе на яе пад рознымі вугламі.

Акрамя таго, сярод наваўвядзенняў — фігурка званочка ў чарніліцы карычневага колеру, прычым званок (Liberty Bell) знікае пад вызначаным вуглом.

На сёння ў свеце выпушчана парадку 6,5 млрд банкнот старога ўзору. Як і раней, банкноты новага дызайну будуць у абарачэнні нараўне са старымі, і ў іх трымальнікаў не будзе ўзнікаць праблем пры аплаце імі, запэўніў кіраўнік ФРС Бэн Бернанке. Ён таксама панаракаў, што змагацца з падробкамі амерыканскіх банкнотаў становіцца ўсё цяжэй з кожным годам з-за развіцця і даступнасці тэхналогій, а таксама ўсё большага абарачэння валюты ЗША за межамі краіны. Так, за межамі Амерыкі знаходзіцца ў абарачэнні да 2/3 стадоларавых купюр.

## САРКАЗІ ЦАЛКАМ ЗАБАРОНІЦЬ НАШЭННЕ ПАРАНДЖЫ Ў ФРАНЦЫІ

**Прэзідэнт Францыі Мікаля Сарказі даручыў ураду Францыі распрацаваць законапраект, які забараняе нашэнне паранджы і нікаба ў грамадскіх месцах. Пра гэта паведамляе Associated Press.**

Кіраўнік Французскай Рэспублікі заявіў, што неабходна забараніць любую традыцыйную адзежу, якая цалкам закрывае твар і цела, бо яна зневажае жанчын. Ураду даручана падрыхтаваць законапраект у найкарацейшы тэрмін, і ўжо ў маі перадаць яго на разгляд у парламент.

«Мы не можам дапусціць, каб у нашай краіне былі жанчыны, зняволеныя за сеткай паранджы, адарваныя ад грамадскага жыцця, пазбаўленыя самавызначэння. Гэта не мае нічога агульнага з тым, як годнасць жанчыны разумеецца ў Французскай Рэспубліцы», — раней заяўляў Сарказі.

У той жа час шэраг французскіх экспертаў кажа, што забарона на нашэнне традыцыйнай мусульманскай адзежы супярэчыць Канстытуцыі Францыі. Акрамя таго, яна можа выклікаць сур'ёзную незадаволенасць у 5 млн мусульман, якія пражываюць у краіне.

Францыя не адзінокая ў сваіх спробах барацьбы з паранджой. Сёння парламент Бельгіі разгледзіць законапраект, па якім за нашэнне паранджы будуць саджаць у турму на тэрмін да 1 года.

## МАСКВА ЎСТРОІЛА ПЕРАВАРОТ У КЫРГЫЗСТАНЕ, АЛЕ НЕ СПРАЎЛЯЕЦЦА З ЯГО НАСТУПСТВАМІ?

**Крэмль згуляў ключавую ролю ў звяржэнні Бакіева, аднак потым зразумеў, што, хутчэй за ўсё, узяўся «за арэшак, які яму не па зубах», піша брытанская газета The Guardian.**

Курс Расіі ў адносінах да Кыргызстана ў апошнія месяцы перад паўстаннем вельмі нагадваў тактыку ЗША напярэдадні «каляровай рэвалюцыі» ва Украіне, лічыць выданне.

Зараз жа Расія «праваменрна занепакоена тым, што нарабіла». Гэтую выснову аўтар артыкула зрабіў з перасцярог прэзідэнта Расіі Дзмітрыя Мядзведзева пра небяспеку анархіі і ператварэнні краіны ў другі Афганістан. Да прамой інтэрвенцыі, лічыць журналіст, не дойдзе, але становіцца зразумела, што «дэмакратычны Кыргызстан, магчыма, апынецца меней згодлівым, чым хацелася б Маскве», перадае InoPressa. Аўтар артыкула піша таксама, што да небяспек «змены рэжыму, падсцёбнутай звонку» належаць і міжнацыянальныя сутычкі, і ісламісцкая агітацыя. Аглядальнік не верыць, што ў кіраўніка часовага ўрада Розы Атунбаевай хопіць аўтарытэту, каб прадухіліць раскол краіны.

## АСУДЖАНА ГРУПА СУТЭНЁРАЎ

**Шасцёра грамадзян асуджаны ў Брэсце за сутэнёрства. 35-гадовы брастаўчанін і яго сужыцелька арганізавалі, па сутнасці, падпольны дом цярпімасці. У іх працавалі тры прастытуткі.**

Чацвёра ўдзельнікаў злачыннай групоўкі адшуквалі кліентаў і прывозілі іх да дзяўчат. Усе шасцёра прызнаныя вінаватымі ў незаконным промысле і асуджаныя на тэрміны зняволення ад 9 да 7 гадоў. Тры гады турмы атрымала і гаспадыня кватэры, жыллё якой выкарыстоўвалася як дом спатканняў. Сухімі з вады выйшлі толькі працаўніцы нялёгкай найстаражытнейшай прафесіі.

**Яна СВЕТАВА.**

## ЗАГІНУЛІ ПАД ТРАКТАРАМ І «МАЗАМ»

У Жабінцы 33-гадовы вадзіцель не справіўся з кіраваннем, выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з трактарам «МТЗ 82». Вадзіцель аўтамашыны загінуў, а пасажыр і трактарыст апынуліся ў бальніцы.

І ў гэты ж дзень у Століне вадзіцель аўтамабіля «ВАЗ» паехаў на чырвоны сігнал святлафора і трапіў пад «МАЗ». Вадзіцель легкавушкі загінуў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

ISSN 1990 - 763X

Паритетбанк

ОАО «Паритетбанк», г. Минск, ул. Гамарника, 9/4

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2010 г.**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2010 | 01.04.2009 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 9 996,7 | 11 248,8 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 7 249,8 | 3 173,9 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | 4 880,8 | 11 936,1 |
| | для торговли | 11031 | – | – |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | – | – |
| | в наличии для продажи | 11033 | 4 880,8 | 11 936,1 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 69 636,0 | 75 937,4 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 273 204,9 | 193 579,3 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 69,7 | 16,0 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 24 141,7 | 18 487,7 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 12 168,0 | 5 440,9 |
| **10** | **ИТОГО активы** | **110** | **401 347,6** | **319 820,1** |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 50 000,0 | 100 000,0 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 52 735,6 | 16 683,5 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 157 980,2 | 86 908,3 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | 14 869,1 | 1 208,6 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 4 935,9 | 4 499,9 |
| **17** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | **280 520,8** | **209 300,3** |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 93 368,4 | 93 368,4 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | – | – |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 4 835,8 | 1 555,9 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 15 044,7 | 8 751,9 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 7 577,9 | 6 843,6 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 120 826,8 | 110 519,8 |
| **25** | **ИТОГО обязательства и капитал** | **12** | **401 347,6** | **319 820,1** |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 228 874,0 | 183 877,6 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 107 925,1 | 72 473,9 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2010 г.**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2010 | 01.04.2009 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 13 671,9 | 10 633,6 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 5 210,9 | 5 962,8 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 8 461,0 | 4 670,8 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 1 790,8 | 1 017,6 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 265,4 | 107,1 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 1 525,4 | 910,5 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 1 122,7 | 1 292,8 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (-7,6) | 153,2 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | - | - |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 1 884,0 | 761,2 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 692,3 | 396,4 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 5 825,0 | 4 791,8 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 635,3 | 478,0 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 600,3 | 41,9 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 2 849,2 | 1 350,8 |

**Председатель Правления** **С.Л. Панковец**

**Главный бухгалтер** **М.М. Абраменко**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 27.10.2006 г. № 5. УНП 100233809.*

С целью удовлетворения потребительского спроса

ОАО «КРАСНОСЕЛЬСКСТРОЙМАТЕРИАЛЫ»

ОСУЩЕСТВЛЯЕТ ПРОДАЖУ И ОТГРУЗКУ ПРОДУКЦИИ ЕЖЕДНЕВНО, в том числе в выходные и праздничные дни.

Телефоны для справок:

Цементный завод (01512) 35368

Известковый завод (01512) 37630

Завод АЦИ (01512) 35260, 35541

www.cementby.com

УНП 590118061.

**Віншуем!**

# ГлебаВІК

## Што падтрымлівала пісьменніка Віктара Казько ўсе яго 70 гадоў?



*Беларускі пісьменнік, вядоўца звяздоўскага конкурсу апавяданняў, не належыць да тых асобаў, якія выкарыстоўваюць усе сучасныя тэхналогіі дзеля таго, каб нагадаць пра сябе. І не думаюць пра нагоду, якая з'яўляецца для гэтага — няхай гэта выхад новай кнігі ці нават юбілей. Таму нагадаем мы, прычым апавяданнем, якое ў нейкім сэнсе сімвалічнае ў дзень нараджэння: пра хлопчыка, які вучыцца суіснаваць у свеце — з роднымі, боскімі істотамі, з тымі нябачнымі сіламі, якія стаяць за правым плячом ці за левым, і робіць свой дзіцячы выбар, які, напэўна, вызначыць яго шлях.*

*І што асабліва нечакана: сам Віктар Казько быў пазбаўлены вось такога «ружовага» выбару, бо вельмі маленькім патрапіў на самы складаны шлях, які толькі можа быць. Страціўшы родных у вайну, ён папоўніў сіроцкую сям'ю, а замест роднай хаты бачыў дзіцячыя дамы. Але, магчыма, зло, якое прывяло да жудасных страт, якога ён бачыў зашмат, насуперак абставінам нарадзіла ў яго душы жаданне супраціўляцца і ствараць свой шлях самому, каб адно толькі — прыйсці да сябе.*

*Магчыма, юнаку здавалася — каб пачаць жыццё наноў, трэба паехаць як мага далей, адарвацца — ад балючай памяці, ад думак пра тое, з чым выходзіш у свет... Ён быў вельмі малады і не спадзяваўся на лёгкі хлеб. Таму заехаў далёка — у Сібір, у Кемерава — вучыцца здабываць тое каштоўнае, што можа даць зямля чалавеку. Напэўна, у тых, хто штодня спускаецца ў шахту, моцны характар: яго стрыжань — самазахаванне. А вызначае яго здольнасць разумець, што адбываецца ў самых далёкіх, патаемных пластах глебы і можа мацаваць чалавечае жыццё ці пагражаць яму. Ці не тады, калі даводзілася працаваць у шахце, і нарадзілася ў Віктару Казько жаданне ўглядацца ўглыб і адчуць пад нагамі трывалую глебу?*

*А пытанні, якія вырываліся з глыбінь душы, нязменна патрабавалі адказаў — перш за ўсё для самога сябе. Ён знайшоў спосаб разабрацца і з першымі, і з другімі — акрэсліўшы іх у словы. І ўжо скончыўшы Маскоўскі літінстытут, адчуўшы аднойчы, што думкі аднаго чалавека могуць быць цікавыя каму-небудзь яшчэ, паглядзеўшы на вялікі свет, ён стаў на дарогу, якая нібыта па коле прывяла яго да таго, адкуль усё пачыналася.*

*Віктар Казько вярнуўся ў Беларусь, калі яму пераваліла за 30, і зноў быў вымушаны пачынаць з пачатку. І хоць яго ўжо друкавалі ў «Новом мире», радзіма прымала насцярожана. Трэба было даказаць сваю годнасць быць пісьменнікам менавіта тут. З тымі думкамі, якія былі важныя для тых, хто тут. А іх ён ведаў...*

*І ў аповесці «Суд у Слабадзе» апісаў вайну вачыма дзіцяці — ці не пра сябе самога? Ды і ў рамане «Хроніка дзетдомаўскага саду» працягнуў. Пра тое, што балела. Так супала — балела яму асабіста і яго радзіме. Так і ішло: балела радзіме — хвалявала і яго. Найперш тое хвалявала, што самі людзі найбольш маглі прычыніць зло сабе і іншым, калі выгоды цывілізацыі прымушалі маўчаць іх сумленне. І калі прага выгодаў прыводзіла да жудасных катастроф, якой стаў для Беларусі Чарнобыль (пра гэта гаворыцца ў аповесці «Выратуй і памілуй нас, чорны бусел»).*

*Думкі пра тое, хто ў чалавека за правым плячом стаіць, а хто за левым, ніткай праходзілі праз усе творы Віктара Казько. Адкуль нараджаецца зло і як ствараецца дабро — дзе яно жыве, на чым трымаецца? Пра гэта, дарэчы, і ў апошнім рамане Віктара Казько «Бунт незапатрабаванага праху», дзе герой дакопваецца да праўды шляхам цяжкіх перажыванняў — калі ідзе да сваіх каранёў. Якое зло часам трэба перажыць чалавеку, каб адчуць каштоўнасць таго добрага, што можа быць падаравана жыццём... Віктар Казько з тых пісьменнікаў, якія трывала стаяць на глебе вечных каштоўнасцяў, а за імі — такая глыбіня, да якой ісці можна бясконца.*

**Ад рэдакцыі.**

Віктар КАЗЬКО

# ПРА МОЦЮ І КАРОВУ



Апавяданне

У той дзень ён устаў з левай нагі. Але каб гэта толькі адно, жыць яшчэ можна было. Ногі — левая, правая — увесь час гуляліся з ім: думаў пра адну, а адзывалася другая. Ці то думкі былі такія хуткія, што апярэджвалі ногі, ці то ногі распусціліся і сваволілі. А ён жа кожны вечар, хаця і вымушана, старанна мыў іх мылам. Яны ўсё роўна не прызнавалі дабра.

Вось і сёння, калі ён ужо ўстаў, але яшчэ не прачнуўся, пачаў абувацца, замест правай падсунулася левая. А гэта было зусім няправільна. Ён добра гэта ведаў. Увогуле шмат чаго ў сваім жыцці ўжо ведаў: справа ад чалавека знаходзіцца анёл, а злева — чорт. Такім чынам, ён і сёння абудзіў і пачаў дзякаваць чорту. І як у ваду глядзеў. Не паспеў сесці за стол, як маці падсунула да яго якуюсьці шараватую і клейкую размазню ў талерцы.

— Хумня, — адмовіўся ён есці яе.

— Якая ж хумня, якая хумня, — порстка ўскінулася маці, але зірнула на бацьку і адразу ж асеклася. — Гэта ж аўсянка, хоць і не на малацэ, але вельмі карысная, Моця.

— Моця ў балоце, — адказаў ён. — А я Мацвей, і ў сваёй хаце мне лацвей.

Ён не любіў зранку гэта сваё ўкарочанае і нейкае дзявочае імя. На пачатку дня нават не адгукваўся на яго.

— А вось і бананчык табе, Мацвейка, — паправілася маці і падала яму нейкую жаўклявую і крывую плешку, што ўжо зусім, пэўна, абурыла сына. Ён хацеў шпурнуць той «баняньчык» у камешнік, але адчуў, што гэта будзе таксама няправільна: раскідвацца ежай грэх. Ды і было ўсё ж нешта ласкавае ў тым «баняньчыку», было. Узяць толькі адзін пах яго. Але Моцю тым ранкам не спакусіў і салодкі, мядовы пах заморскага ласунка.

— Які ж дурань зранку ў вёсцы, на адпачынку пасля дзіцячага сада, есць бананы, — абурана выказаўся ён і замоўк, падцяўшы вусны.

Характар, характар. Як што ні па ім, дык хоць кол на галаве цяшы. Мужык, нічога не скажаш. А ён да ўсяго яшчэ і паляшук. А палешукі, як вядома, нават малыя, — людзі ўпартыя і ці не ўвогуле зацятыя. На тое яны і палешукі, што карчы ў лесе, ці сёння ўжо на дрывотні дубовыя калодкі, на якіх сякуць дровы. Ты іх і калуном, і сякерай — і што ў лоб, тое і па лобе, яны толькі крэкчуць ды мацуюцца, урастаючы ў зямлю. Такім прыземлена непахісным, настойлівым ды непадатлівым на чужыя ўгаворы быў і Мацвей, ці хацеў выдаваць сябе за такога — у свой род, у бацьку з маці, што ўперліся рогам у гэту жытку, і хай рог той адпадзе, чым яны збочаць.

І як рогам Мацвей уталопіўся ў вялікую алюмініевую кружку, што стаяла на стале сярод іншага посуду. Пустую кружку. Але яна не заўсёды была пустой. Бацька піў з яе гарбату, калі служыў у войску. З войску прыхапіў з сабой, а пазней падарыў сыну:

— Пойдзеш у армію са сваёй кружкай.

Арміі Мацвейку было яшчэ доўга чакаць. А калі ў прадчуванні яе ён усё ж спрабаваў піць з кружкі гарбату, апякаўся. Але апошнім часам, у вёсцы, ён піў набгом цёплы, яшчэ пасля каровы сырадой. Цёплы і з шумам, што ці не цалаваў яго ў вусны і пакідаў на іх такую гожую беленькую адзнаку, якую ён старанна злізваў кончыкам языка, працягваючы асалоду паху сырадою, каровы, хлява і, здаецца, сонца.

Вось на гэту, некалі поўную малака, а цяпер зусім-зусім пустую, бляшанку, а не посуд, адсунуўшы карысную кашу і заморскі банан, нязводна і прагна і пазіраў Мацвейка.

Маці без слоў зразумела яго і патлумачыла:

— Няма малака, Мацвейка, няма. Не дае карова малака. Запусцілася.

Тое, што карова не дае малака, Мацвейку было зразумела, часам і ён чагосьці не даваў. А вось «запусцілася» было яму ў навіну. Адно: распусціліся ногі. А як гэта бывае ў кароў і чаму? Як гэта яны запускаюцца ці распускаюцца, нібыта дрэвы ці кветкі. І галоўнае, нехта чагосьці не дае. І не дае не каму-небудзь, а яму. Ён можа некаму нечага не даць. А каб не далі яму? Тая ж карова пашкадавала яму малака. Спачатку прызвычаіла, прыручыла, а потым запусцілася ці распусцілася і адмовіла. Нешта тут было не так. Няўжо і з каровамі здараецца, што яны ўстаюць не з тае нагі. І чорт падбухторвае іх на шкоду і шкадобу яму малака. З гэтым трэба было разабрацца і дапамагчы карове: прагнаць чорта і абудзіць анёла. Анёла, які прыходзіць да яго ранкам з поўнай алюмініевай салдацкай кружкай, як бабуля гаворыць — карцом, цёплага і сонечнага сырадою. І Мацвейка счакаў, пакуль усе дарослыя сыдуць з хаты і ён застанецца адзін. Калі гэта адбылося, аберуч аплёў кружку і пашыбаваў у хлеў да каровы. У хляве было ўтульна. Праз шчыліны ў сценах коса прабівалася сонца. Проста лілося крыжаванкамі і плазам прыпадала да саломы, залаціла яе, што надавала яму ўпэўненасці і спакою, адчування, што ён усё робіць правільна. Крыху аслеплены і прыгаломшаны няроўным і зыбкім святлом хлява ён асцярожна пачаў набліжацца да каровы, што і так была рабая, а цяпер і зусім спярэсцілася.

Ці не на першым жа кроку перакана́ўся: асцерагацца было чаго. Падыходы да каровы былі замініраваныя. І ў адну з мін улез адразу дзвюма нагамі. Хоць гэта было нечакана і трохі брыдка, Мацвей не надта расстроіўся:

— Так вам і трэба, — нікольі не гідуючы, помсліва мовіў ён, гледзячы, як зеленаваты гной прасочваецца скрозь пальцы ног. І, пэўна, меў рацыю так сказаць, таму што далей было яшчэ горш. Каб усё ж зноў не патрапіць на міну, ён пачаў трымацца сцяны і наскочыў на дошку з выпнутым цвіком. Сур'ёзны ці не быў цвік, але пеканула добра. І адразу ж зеленаваты гной пачаў заплываць рудаватай кроўю.

Мацвейка і тут паказаў характар:

— Панакідалі дошак з цвікамі. Добраму чалавеку і не прайсці. Рукі б вам пааббіваць, гаспадары!

Але хоць апёк быў імгненны і не такі ўжо страшны, крыві болела. І яна хутка перафарбавала гной і заліла ўсе пальцы на левай, чортавай, назе. А калі Мацвей узняў гэту нагу, пачала капаць і на салому рэдкімі, але ярка-чырвонымі ігольчатымі па краях, пырскамі.

Вось толькі тады, разглядзеўшы гэтыя іголачкі, Мацвейка заплакаў, хутчэй нават заскавытаў, заскуголіў. І больш не ад болю і страху, а таму, што адступаць ён не думаў. Не на таго напалі, не таго ўздумалі затрымаць. Ён заўсёды дамагаўся свайго, ніколі не ўцякаў нават ад сабак, мо толькі перад гусаком, і то калі нікога не было побач, кідаўся прэч.

Мацвейка дадыбаў да каровы. Тая неяк зняможана ляжала на баку і сачыла за ім чарнільным вокам, навесіўшы на губу празрыстую нітку сліны.

— Ты што гэта распусцілася, — звярнуўся да яе Мацвейка. — Ты думаеш, я на бананах пражыву? Давай малако.

Карова ўздыхнула ўсім целам, мыкнула, паспрабавала падняцца, але чамусьці перадумала. Адно толькі варухнула пярэднімі нагамі, напружыла іх, сагнула ў коленцах і адразу разагнула, супакоіла. І зноў цяпер ужо сумна і працягла ўздыхнула і мыкнула. Ад чаго яе губы, асабліва ніжняя, набылі падабенства з губою бабулі, калі тая прыхворвала. Розніца была толькі ў памерах.

— Глядзі ты, — здзівіўся Мацвейка, — што карова, што бабуля — адразу і не разбярэшся. Давай малако, ці не бачыш, што я паранены.

Ён працягнуў карове кружку, а мо і карэц. Пустая кружка, здаецца, карову праняла. Яна, хоць і цяжкавата, паднялася. Павярнулася да Мацвейкі і вільготнымі губамі пачала залізваць яго шматлікія віхры. Сапраўды шматлікія. Чэрці разам з ведзьмамі на галаве ладзілі вяселле.

— Не пераменішся — такое ж кручанае і жыццё будзе, — гаварыла пра яго віхры бабуля, цалуючы яго ў макаўку. І Мацвейку гэта падабалася, але тут было не да сантыментаў.

— Ты сліну асабліва не распускай, — нават крыху зазлаваў ён. — Во калі малака дасі...

І тут Мацвейка ўбачыў... Убачыў, што ў хляве не адна карова, а адразу дзве. Толькі другая маленькая і з лысінкай на лобе. Галава ж дарослай, сапраўднай каровы была чорнай, што галавешка.

— Адкуль, адкуль, — разгублена спытаўся Мацвейка ў цацачнай каровы. — Лысінка адкуль...

І гэта маленькая кароўка з лысінкай тыцнулася якраз жа той лысінкай пад паху Мацвейку. Малое-малое, а ледзьве не паваліла яго. Мацвейка хацеў ужо адказаць крыўдзіцельніцы належным чынам, як гэта яна прарабіла з ім. Але не хапіла спрыту. Лысенькая вырода адвярнулася ад яго, прыпала да цыцак каровы, як знайшла там нешта спажыўнае і вельмі смачнае, з мілагучным прыцмокам пачала смактаць іх.

У тым, як яна прарабляла гэта, было нешта да дрыжыкаў знаёмае Мацвейку. Знаёмае мо яшчэ да яго з'яўлення на свет і таксама, здаецца, у такі сонечны прамяністы дзень. І таксама ў хляве, сярод саломы. Толькі ці карова і цялё былі там. Хаця нешта падобнае і вечнае. І гэта былі не яго памяць і не яго веданне — нешта таксама вечнае.

А цялё ўжо было побач з Мацвейкам, мякка злізвала белую стужку са сваіх чорных і крыху змардаваных, падобна, ссінелых губ. Злізвала, высалапіўшы кароценькі чырвоны язычок. Але гэта добра знаёмая Мацвейку справа не збіла яго з панталыку, ён добра ведаў, чаго прыйшоў у хлеў да каровы, нават кружку з рук не выпусціў.

— Ну, ты і нахлебнік, — сказаў ён маленькай карове і паўтарыў: — Ну, ты і нахлебнік. Будзем дзяліцца. Будзем дзяліцца.

# ЗЯМЛЯ ПАД БУДАЎНІЦТВА



**Адным з найважнейшых момантаў, якія трэба было ўлічваць падчас будаўніцтва хаты, быў дакладны выбар спрыяльнага месца. Нашы продкі былі перакананыя, што якраз шчаслівае месца адорыць сям'ю шчаслівым лёсам і дабрабытам. На Палессі лічылі, што хату трэба будаваць там, «дзе цёплая зямля і паветра».**

● Спрыяльным лічылася тое месца, дзе збіралася хатняя жывёла або «купаліся» куры.

● Адным з найбольш спрыяльных лічылася месца, дзе быў мурашнік чорных мурашак. Яго пераносілі ў новае месца і нейкі час назіралі, як мурашы будуць абжывацца на новым месцы: калі хутка, то месца для пабудовы новай хаты выбрана удала.

**Новую хату не будавалі:**

● паблізу ад могілак або на былых ці разбураных месцах пахаванняў;

● там, дзе было здзейснена забойства чалавека або некалі адбывалася крывавая бітва;

● на месцы раскарчаванага саду або на тым месцы, дзе спатрэбілася выкарчаваць хаця б адно садовае дрэва;

● на тым месцы, дзе нядаўна было жытнёвае поле (хутка адбудзецца пажар);

● зусім недапушчальным лічылася будаваць дом на тым месцы, дзе некалі быў пажар або ляснула маланка;

● неспрыяльнымі лічыліся месцы, звязаныя з якой-небудзь бядой: дзе падчас буры зламала дрэва, некалі перавярнуўся воз, дзе нехта паваліўся і зламаў руку ці нагу.

● На вялікі жаль, зямля, узятая з кепскіх мясцін або нагавораная словамі чорнай магіі, можа стаць першапрычынай вашых бедаў і няшчасцяў. Таму ведайце: калі побач з вашым парогам вы знайшлі магільны пясок або нагавораную зямлю, станавіцца на яе нельга. Яе трэба сабраць (толькі не голымі рукамі), аднесці на скрыжаванне дарог і, па магчымасці, спаліць.

● Калі вы купляеце зямлю для будучай сядзібы, лепш разлічвайцеся дробнымі грашамі. Тым самым вы зберажэце будучы ўраджай на гэтай зямлі.

● Перад тым як упершыню нешта пасадзіць на сваім агародзе, зрабіце наступнае: у добрае надвор'е, калі бачны зоры, абыдзіце агарод крыж-накрыж і скажыце: *«Зямля нарадзіла, зямля ўзбагаціла. Маці Божая, захавай. Амінь»*.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## 23 красавіка

Дзве даты

**Сёння — Сусветны дзень кнігі і аўтарскага права. Абвешчаны на XXVIII сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА (1995) у памяць трох геніяў сусветнай літаратуры — У. Шэкспіра, М. Сервантэса і Інкі Гарсіласа дэ ла Вегі, якія з'явіліся на свет у гэты дзень.**

**1793 год** — у выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай цэнтральная частка беларускіх земляў была далучана да Расіі і ўказам Сената была створана Мінская губерня, якая ўключала ў сябе 13 паветаў.



**1185 год** — рускі князь Ігар Святаслававіч у саюзе з іншымі князямі рушыў у паход супраць полаўцаў. У першым баі рускія князі разбілі полаўцаў, але, зайшоўшы далёка ў стэпы, пацярпелі паражэнне і былі захоплены ў палон. Гэтыя падзеі апісаны ў старажытнарускім літаратурным помніку «Слова пра паход Ігараў».

Цытата дня

***«Занадта старанны пошук слова часта псуе ўсю прамову. Найлепшыя словы — гэта тыя, якія з'яўляюцца самі сабой, яна падказаны самой праўдай».***

**Марк Фабій Квінтыліян (35—96), рымскі прамоўца і тэарэтык прамоўніцкага мастацтва.**

## Усміхнемся!

— Гэй, прыгажосць, выратуй свет, зганяй за півам!

☺

**Асаблівасць нашай утылізацыі: лягчэй тры разы на дзень утоптваць смецце ў вядро нагой, чым на адзін раз часцей яго вынесці...**

☺

— Чуў, Эйяф'ятлаёкюдль ажыў?

— А ты ўпэўнены, што не Хванадальснукюр?

— Вядома, бо Хванадальснукюр знаходзіцца каля самога Каульвафедльстадзюра, а Эйяф'ятлаёкюдль бліжэй да Вестманаэйяру, калі ехаць у бок Снайфедльс'ёкюдля.

— Дзякуй богу, а то ў мяне сваякі ў Брунхаўльскірк'я!

Калі вы без запінкі прачыталі ўголас гэты дыялог — значыць, вы ісландзец.

☺

**Пра што б жанчына ні казала, гаворка ідзе пра загс; пра што б ні казаў мужчына, гаворка ідзе пра сэкс.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.51 | 20.26 | 14.35 |
| Віцебск — | 5.37 | 20.19 | 14.42 |
| Магілёў — | 5.41 | 20.16 | 14.35 |
| Гомель — | 5.42 | 20.08 | 14.26 |
| Гродна — | 6.07 | 20.41 | 14.34 |
| Брэст — | 6.12 | 20.37 | 14.25 |

**Месяц**

***Першая квадра 21 красавіка. Месяц у сузор'і Дзевы.***

**Імяніны**

***Пр.** Аляксандра, Максіма, Рыгора, Фёдара, Цярэнція, Якава.*

***К.** Ілоны, Войцэха, Юрыя.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.






## Уважаемые акционеры ОАО «ЖАБИНКОВСКИЙ САХАРНЫЙ ЗАВОД»

**4 мая 2010 года** состоится внеочередное общее собрание акционеров **ОАО «Жабинковский сахарный завод»,** расположенного по адресу: г. Жабинка, ул. Калинина.

Собрание пройдет по адресу: г. Жабинка, ул. Калинина, зал заседаний заводоуправления ОАО «Жабинковский сахарный завод».

**Повестка дня собрания:**

**О согласовании предоставления безвозмездной (спонсорской) помощи.**

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: в рабочие дни (понедельник — пятница), начиная с 23.04.2010 г. по 03.05.2010 г. по месту нахождения Общества: г. Жабинка, ул. Калинина, заводоуправление (отдел кадров) с 8.00 до 16.30, 4 мая 2010 г. по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 12.00 до 12.45 по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания — 4 мая 2010 года, 13.00.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 28 апреля 2010 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: **акционеру общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.**

УНП 200037600.

В СВЯЗИ С ПРОЦЕССОМ ЛИКВИДАЦИИ УП «ЛАНДЫШ» ЛИКВИДАЦИОННАЯ КОМИССИЯ

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН СЛЕДУЮЩИХ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ:

**Лот 1.** Склад для топлива об. пл. 68,6 кв. м, производственный цех об. пл. 272,6 кв. м, котел КСИ-0,09Т, забор чугунный, туалет кирпичный, *Слуцкий р-н, д. Греск, ул. Минская, 1.* Начальная стоимость с НДС — 33176634 бел. руб. (снижена на 50 %). Задаток — 10 % от указанной стоимости. Зем. участок для обслуживания объектов будет выделен из земельного участка об. пл. 0,3272 га, находящегося в постоянном пользовании УП «Ландыш».

**Лот 2.** Швейный цех об. пл. 394,2 кв. м. *Слуцкий р-н, д. Греск, ул. Минская, 1.* Начальная стоимость с НДС — 64584339 бел. руб. (снижена на 50 %). Задаток — 10 % от указанной стоимости. Зем. участок для обслуживания объектов будет выделен из земельного участка об. пл. 0,3272 га, находящегося в постоянном пользовании УП «Ландыш».

**Лот 3.** Здание цеха об. пл. 3406,5 кв. м, ограждение (кирпичное; ж/б), таль электрическая ТЭ-050, котел КСТ-25, котел КСВ-0,09Т, кабель электроснабжения 0,4 кВ, *г. Слуцк, ул. М. Богдановича, д. 57а.* Начальная стоимость с НДС (снижена на 50 %) — 442871030 бел. руб. Задаток — 10 % от указанной стоимости. Зем. участок для обслуживания объектов будет выделен из земельного участка об. пл. 1,6491 га, находящегося в постоянном пользовании УП «Ландыш».

Объекты продаются без условий. Задаток перечисляется на р/с 3012200130017 в ОАО «БелАПБ» г. Слуцк, МФО 153001921, УНП 600154422 УП «Ландыш».

Аукцион состоится **25.05.10 г. в 12.00** по адресу: 223610, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 57а.

**Контактные тел.: 801795 2 43 26, м. т. 8029 670 96 63.**

## Управляющий по делу о банкротстве ОДО «КТЭП» Монтик Д.Н. – организатор торгов сообщает о проведении повторных ТОРГОВ по продаже транспортных средств ОДО «КТЭП», а именно:

| № лота | Наименование лота | Количество | Начальная цена продажи лота, бел. руб. (с НДС) | Шаг торгов, бел. руб. (5 % от начальной цены) | Задаток бел. руб. (5 % от начальной цены) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Седельный тягач ИВЕКО 440Е42, 1999 года выпуска | 1 | 39 383 088 | 1 969 154 | 1 969 154 |
| 2 | Седельный тягач СКАНИЯ R 114, 2001 год выпуска | 1 | 54 438 202 | 2 721 910 | 2 721 910 |

Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене.

**Торги состоятся 12 мая 2010 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5.**

До подачи заявки Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичном порядке по следующим платежным реквизитам: ОДО «КТЭП», р/с 3012610151015 в Приорбанк ОАО ЦБУ 602 г. Лиды, код 749, УНП 500268789.

Заявления на участие в аукционе с приложением платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также: для юридических лиц — заверенной копии свидетельства о гос. регистрации, устав; для индивидуального предпринимателя — заверенной копии свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица — копии паспорта принимаются с момента выхода настоящего объявления до **15.00 11.05.2010** по адресу: 230026, г. Гродно, пр-т Я. Купалы, 45—51 или по факсу 8 (0152) 526859.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола.

Иную информацию о порядке и условиях проведения торгов, ознакомлении с предметом торгов можно получить в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5, тел. 8 (029) 6309211, тел./факс 8 (0152) 526859.

## МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

### Аукцион состоится 25 мая 2010 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

| №№ лота | Адрес земельного участка | Площадь, га | Срок аренды | Цель использования | Кадастровый номер | Стоимость землеустроительного дела | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| № 1 | проспект Мира, остановка «Проспект Мира» (от центра) (ограничения – р. Дубровенка) | 0,0015 | до 1.06.2011 | установка и обслуживание торгового киоска (№ 2) в остановочном павильоне | 740100000003005851 | 546 972 | 184 000 | 17 000 |
| № 2 | проспект Пушкинский, остановка «Улица Габровская» (в центр) | 0,0018 | до 1.06.2011 | установка и обслуживание торгового киоска (№ 3) в остановочном павильоне | 740100000006002509 | 546 972 | 158 000 | 14 000 |
| № 3 | проспект Пушкинский, остановка «Улица Островского» (в центр) | 0,0023 | до 1.06.2011 | установка и обслуживание торгового киоска (№ 1) в остановочном павильоне | 740100000005004360 | 546 972 | 204 000 | 18 000 |
| № 4 | проспект Пушкинский, остановка «Универмаг «Октябрьский» (в центр) | 0,0013 | до 1.06.2011 | установка и обслуживание торгового киоска (№ 1) в остановочном павильоне | 740100000006002510 | 546 972 | 114 000 | 10 000 |
| № 5 | улица Гришина, район Привокзального рынка | 0,0016 | до 1.06.2011 | установка и обслуживание торгового киоска | 740100000002001216 | – | 153 000 | 14 000 |
| № 6 | улица Крупской, район торгового центра «Крыніца» (ранее район магазина «Крыница») | 0,0012 | до 1.06.2011 | установка и обслуживание торгового киоска | 740100000002004251 | – | 95 000 | 9 000 |
| № 7 | улица Лазаренко, район Виленского рынка | 0,0016 | до 1.06.2011 | установка и обслуживание торгового киоска | 740100000003005009 | – | 158 000 | 14 000 |

**Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.**

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

Заверенную копию платежного поручения о внесении **задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж).

**Юридические лица:** доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

**Индивидуальные предприниматели:** копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

**Граждане** – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких предметов аукциона, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона **с наибольшей начальной ценой.**

1) Условия инженерного развития инфраструктуры: земельные участки расположены на застроенной территории, в непосредственной близости имеются все инженерные коммуникации.

2) Условия проведения аукциона (наличие не менее двух участников).

3) Условие предоставления земельных участков в аренду: согласование типа киосков, павильонов с управлением архитектуры и градостроительства Могилевского горисполкома.

4) Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим.

5) В течение **10 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельных участков победителям аукциона **оплатить стоимость предмета аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона,** в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукциона. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 5 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Последний день приема заявлений – 19.05.2010 года до 17.00.**

**Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.**



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 1952. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ЗВЯЗДА 23 красавіка 2010 г.

**Выбоины на проезжей части, колея, отсутствие разметки,
но при этом ежедневная уборка мусора за вами
ИЛИ
ровная, без выбоин проезжая часть, яркая разметка,
но при этом горы мусора на обочинах, площадках и остановках.
ЧТО ВЫБИРАЕТЕ ВЫ?
Мы предлагаем ровную, без выбоин проезжую часть,
яркую разметку, хорошо читаемые дорожные знаки,
современные ограждения и отсутствие мусора!
Скажете невозможно, на это не хватит ни времени, ни денег?
Хватит! ЕСЛИ ВЫ ПЕРЕСТАНЕТЕ МУСОРИТЬ НА АВТОДОРОГАХ!**

**В 2009 Г. НА УБОРКУ МУСОРА НА РЕСПУБЛИКАНСКИХ АВТОДОРОГАХ МИНСКОЙ ОБЛАСТИ ЗАТРАЧЕНО 14 000 000 000 РУБ.!**

**РУП «Минскавтодор-Центр».**

Генеральны дырэктар Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскаўтадар-Цэнтр»
Максім БАХАЎЧУК:

# «ЧЫСТА ТАМ, ДЗЕ НЕ ТОЛЬКІ ПРЫБІРАЮЦЬ, АЛЕ І НЕ СМЕЦЯЦЬ»

## ПАЧНІЦЕ З СЯБЕ!



*Паважаныя сябры! Такія знакі, як вы бачыце вышэй, у самым хуткім часе з'явяцца і на дарогах, і на прыпынках грамадскага транспарту, і на пляцоўках адпачынку. На гэты беспрэцэдэнтны крок нас вымусіла пайсці само жыццё. Апошнім часам у Беларусі вельмі шмат робіцца для таго, каб дарогі нашай транзітнай рэспублікі сталі камфортнымі і бяспечнымі для карыстальнікаў. Што датычыцца догляду самой праезнай часткі, то грошай сёння, як і 10, і 20 гадоў таму, вядома ж, не хапае. Хочацца зрабіць вельмі многае. І ўдвая крыўдна, калі такія неабходныя для дарог сродкі мы сёння вымушаны выкідваць на вецер. Не здзіўляйцеся, а толькі ўдумайцеся ў адну лічбу: калі летась на ўтрыманне ўсёй сеткі нашых дарог прадпрыемству было выдаткавана 68 млрд рублёў, то 14 млрд з гэтай сумы пайшло на... уборку смецця! Менавіта за яго сёння даволі адчувальна «б'юць» дарожнікаў. Зразумела, што кожнаму з нас прыемна ехаць па чыстай дарозе, назіраць з акна роўную, прыгожую, чыстую ўзбочыну. У той жа час, напэўна, нам не менш важна ехаць па бяспечнай, роўнай, без выбоін праезнай частцы. Пра ўзаемасувязь людзі не задумваюцца. А вельмі шкада.*

*Да летняга сезону мы абавязкова ўсё пафарбуем, пабелім, зробім новую разметку, ліквідуем ямачнасць, пастараемся справіцца і з усім астатнім... Але мы маглі б зрабіць намнога больш, каб сілы і сродкі не даводзілася кідаць на ўборку дарог і ўзбочын ад зусім неабавязковага смецця, якое выкідваюць з праязджаючых машын не вельмі выхаваныя грамадзяне, вывозяць і вывальваюць на прыпынках транспарту дачнікі... Сёння нашы патрульныя машыны два разы на дзень выязджаюць на ўборку. І нават гэтага не дастаткова. Штодзень брыгады дарожнікаў збіраюць каля 200 мяхоў смецця толькі з МКАД! Але ж, гэта зусім не іх задача, і выконваюць яе дарожнікі ва ўрон сваім непасрэдным абавязкам.*

*Праблема смецця на дарогах паўстала настолькі востра, што выйшла на ўзровень губернатара Міншчыны і нават прэм'ера краіны. Выказваецца справядлівае меркаванне, што надышоў час зрабіць больш жорсткімі падыходы да нявыхаваных людзей на дарогах. У цэнтральным рэгіёне адпаведнае даручэнне дадзена праваахоўным органам.*

*Вядома, толькі штрафнымі санкцыямі гэту праблему не вырашыць. Патрэбны выхаваўчыя і тлумачальныя меры. Мы пойдзем і на гэта. Аднак і жорсткі падыход сябе апраўдвае. У той жа Германіі ці Ізраілі штраф за паперку ад цукеркі, выкінутую з акна аўтамабіля, часта супастаўляльны з сярэднім месячным заробкам. Ставіцца да такога падыходу можна па-рознаму, але эфект відавочны.*

*Ці не лепш пачаць з сябе? І ўсяго толькі нявыкінуты фанцік ад цукеркі, не пакінуты на прыпынку пакет са смеццем дазволяць выратаваць не адно жыццё. І адчуць гонар за саміх сябе і за сапраўды еўрапейскія беларускія дарогі.*

**З павагай
генеральны дырэктар Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскаўтадар-Цэнтр» Максім БАХАЎЧУК.**




Вадзіцель падмятальна-ўборачнай машыны «Брадвей» Леанід КЛІМОВІЧ.

**СЁННЯ дарогі Беларусі ўзняліся на якасна новы ўзровень. Іх справядліва параўноўваюць не толькі з аўтатрасамі Польшчы і Прыбалтыкі, але і з дарогамі больш заможных еўрапейскіх краін. За ўсім гэтым стаіць не заўсёды прыкметная, але вельмі складаная і напружаная круглагадзічная і круглаcутачная, у любое надвор'е праца соцень і тысяч сапраўдных прафесіяналаў.**

**Сетка рэспубліканскіх дарог — асаблівая. Яна мае патрэбу ў больш уважлівым стаўленні, вельмі аператыўным рэагаванні, перш за ўсё на ўмовы надвор'я, на дарожную абстаноўку, якая імгненна змяняецца. З-за таго, што менавіта рэспубліканскія дарогі бяруць на сябе асноўныя груза- і пасажырапльіні, рух па іх ажыццяўляецца з дастаткова высокімі хуткасцямі, пытанні ўтрымання сеткі дарог, забеспячэння бяспекі тут асабліва актуальныя. Дарожнікі імкнуцца максімальна эфектыўна выкарыстаць кожны выдаткаваны бюджэтны рубель і вельмі крыўдуюць, калі гэта па незалежных ад іх прычынах не атрымліваецца. А віной таму часта становімся мы з вамі: вадзіцелі, пасажыры, людзі, якія жывуць па суседстве... Адным словам, карыстальнікі дарог.**



Начальнік упраўлення ўтрымання і бяспекі дарожнага руху Андрэй ШЫШОЎ і начальнік дзяжурна-дыспетчарскай службы Аляксандр ЗАЙЦАЎ каля экрана, дзе ў рэжыме «жывога часу» адлюстроўваецца сітуацыя на галоўных участках дарог.

— Як паказвае вопыт развітых краін, пакаранне за выкідванне смецця на дарогах з'яўляецца вельмі магутным стрымліваючым фактарам, лічыць **начальнік упраўлення ўтрымання і бяспекі дарожнага руху Андрэй ШЫШОЎ**.

— У нас сітуацыя крыху іншая. Зусім нядаўна ва ўжытку быў выраз пра тое, што сабекошт складання адпаведнага пратакола большы, чым уласна штраф. Натуральна, кантралюючыя органы проста не хацелі звязвацца з такімі парушальнікамі. А вось выдаць прадпісанне дарожніку за смецце на яго ўчастку куды прасцей (не трэба нікога шукаць, даказваць) і значна больш эканамічна выгадна. Часцяком у выніку чалавек, які па 12 гадзін праводзіць на дарозе, імкнецца захаваць здароўе і жыццё ўдзельнікаў руху, са сваёй кішэні вымушаны заплаціць штраф у 140-200 тысяч рублёў з-за тых жа нявыхаваных вадзіцеляў і пешаходаў, для якіх і працуе... Пагадзіцеся, калі ў чалавека на абслугоўванні знаходзіцца 80 км дарогі і па ёй праязджае 12 тысяч аўтамабіляў за суткі, ён проста фізічна не паспявае за кожным прыбіраць паперкі.



Не прыпыняючы рух на аўтастрадзе, праводзіцца рамонт пакрыцця. Устаноўкай для ямачнага рамонту кіруе машыніст Сяргей КАЎЧАРЭНЯ.

Згодна са службовай інструкцыяй, дарожнікі павінны знаходзіцца на дарозе і забяспечваць якаснае яе ўтрыманне і бяспеку руху: своечасова выявіць і ліквідаваць ямку, паправіць зламаны вандаламі дарожны знак, аднавіць агароджу, устараніць наступствы ДТЗ, убраць з праезнай часткі прадметы, якія перашкаджаюць руху, і г.д. Замест гэтага нашы брыгады вымушаны перакваліфікавацца ў дворнікаў...

Яшчэ адзін сезонны галаўны боль дарожнікаў — дачнікі. У кожным дачным кааператыве павінна быць арганізавана месца збору смецця, заключаны дагавор на яго вываз. Але многія лічаць гэта неабавязковым. І сапраўды, навошта, калі гэтае смецце можна вынесці іываліць на прыпынку аўтобуса... У нас ёсць два самыя адчувальныя ў гэтым сэнсе накірункі: Мінск—Мядзель і Заслаўль—Дзяржынск—Возера. Пасля выхадных збіраем там на прыпынках, без перабольшвання, горы смецця! І самае непрыемнае ў гэтым нават не сам факт, а стаўленне гэтых самых адпачывальнікаў: няважна, што мы тут насвінячылі, чаму за намі своечасова не ўбралі?! Крывая логіка. Перш-наперш кожны павінен пачаць з сябе. І, паверце, тады хутка зменіцца вельмі многае.

Вандалізм — таксама вельмі балючая тэма. Штогод на аднаўленне дарожных знакаў, пашкоджаных прыпынкаў грамадскага транспарту, малых архітэктурных формаў на пляцоўках адпачынку і інш. мы вымушаны выдаткоўваць сотні мільёнаў рублёў! Знайсці, я сказаў бы нелюдзяў, якія ўсё гэта робяць, вельмі складана: як правіла, мы атрымліваем адмовы ў завядзенні крымінальнай справы з-за немагчымасці ўстанавіць асобу парушальніка. Я думаю, не трэба тлумачыць, што азначае на дарозе адсутнасць знака «Круты паварот» ці святлоадбівальнай агароджы ў цёмны час сутак...

Сустракаюцца і вельмі адметныя прыклады сучасных вандалаў. Так, адзін малады чалавек скраў на пляцоўцы адпачынку прыгожа аздобленую лаўку каб... падараваць сваёй каханай дзяўчыне! Прыгожы «падарунак», нічога не скажаш... Другі хлопец з Мінска спецыяльна ездзіў у Слуцк, каб па дарозе размалёўваць аўтапавільёны! Дзякуй міліцыі, хулігана затрымалі.

Усё ж часцей вандалы больш спрактыкаваныя і меркантыльныя. Нядаўна быў выпадак, калі наш галоўны інжынер за руку злавіў цэлую сям'ю на нятаннай іншамарцы, якая сярод белага дня здымала сетку для ўтрымання снегу. Няўжо, маючы такую машыну, дачу, нельга знайсці 100 тысяч рублёў на сетку? Ні сумленне не ўскалыхнулася, нічога... І сыну «добры» прыклад паказалі.




У гэтым выпадку не зразумелая рэакцыя і нас саміх. У гэты час па дарозе ехалі дзясяткі тысяч аўтамабіляў. Перакананы, былі сярод іх і прадстаўнікі праваахоўных органаў, іншыя адказныя асобы. Хоць бы хто спыніўся і зрабіў заўвагу! Ці ў міліцыю патэлефанаваў...

Лічу, што, безумоўна, неабходна зрабіць больш жорсткай адказнасць. Узгадайце, як некалькі гадоў таму аўтамабілісты амаль не карысталіся рамянямі бяспекі. Як толькі ДАІ змяніла сваё стаўленне да гэтага, здавалася б, нязначнага парушэння правілаў, сітуацыя ў корані стала іншай. Людзі прышпільваюцца не задумваючыся, аўтаматычна. Як вынік — сотні, тысячы выратаваных жыццяў!

Як ні дзіўна, але тое ж і са смеццем на дарогах: за каласальныя сродкі, якія дарожнікі проста выкідваюць на вецер, збіраючы смецце, можна было б зрабіць вельмі шмат, у першую чаргу, для бяспекі тых жа ўдзельнікаў руху.

Адразу адзначу, што толькі наша ўпраўленне, якое абслугоўвае 300 км дарог, за год на ўтрыманне сеткі выдаткоўвае менш, чым ідзе на ўборку смецця... За гэтыя сродкі мы маглі б прывесці праезную частку, пляцоўкі адпачынку проста ў ідэальны стан. Пашырылі б выкарыстанне сучасных сродкаў арганізацыі руху: бяспечнай агароджы, святлафораў на сонечных батарэях там, дзе няма лініі электраперадач, халодных і гарачых пластыкаў для дарожнай разметкі, зрабілі б тратуары на транзітных вуліцах населеных пунктаў, паставілі б асвятленне на аўтобусных прыпынках, пешаходных пераходах, на небяспечных участках, дарожныя знакі з плёнкай другога, трэцяга пакалення, зрабілі б такія неабходныя пешаходныя пераходы ў розных узроўнях...

З'яўляючыся транзітнай рэспублікай, маючы такія сучасныя дарогі як траса М-1, проста сорамна дагэтуль мець там наземныя пешаходныя пераходы. Па-першае, гэта небяспечна, па-другое, замежнікі, якія заплацілі валюту за праезд па магістралі, не павінны скідваць хуткасць і высочваць бабулю, якая можа раптам кінуцца пад колы. Наземных пераходаў на трасах такога ўзроўню няма нідзе ў Еўропе! Дык вось, нашых 14-ці «смеццевых» млрд рублёў, і 7 млрд «Аўтастрады», якая абслугоўвае гэту дарогу, было б дастаткова, каб на М-1 не засталося ніводнага наземнага пешаходнага пераходу! Неабходныя падземныя пераходы і на выхадах з Мінска, дзе пешаходам даводзіцца пераадольваць па шэсць палос руху.




На жаль, дагэтуль гэтыя сродкі мы вымушаныя выкідваць на вецер. Ці не лепш разам зрабіць нашы дарогі больш бяспечнымі і камфортнымі?

**Сяргей ПРОТАС, Алена ДАЎЖАНОК і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**

УНП 190638747